РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЖНІЎНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 166 (30554)

Фота БелТА.



# «ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ШТО БУЛЬБЫ Ў БЕЛАРУСІ ДАСТАТКОВА»

## «Другому хлебу» — пільная ўвага кіраўніка дзяржавы

У цэнтры ўвагі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — наша знакавая айчынная сельскагаспадарчая культура, узведзеная ў ранг нацыянальнага прадукту, — бульба. З вырошчваннем другога беларускага хлеба кіраўнік дзяржавы азнаёміўся ў полі — у ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага», што ў Кіраўскім раёне Магілёўскай вобласці. Менавіта сюды ў чацвер беларускі лідар здзейсніў рабочую паездку.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з сартамі бульбы непасрэдна на полі, дзе яна расце, агледзеў умовы захоўвання і правёў нараду па далейшым развіцці гэтага кірунку ў сельскай гаспадарцы.

СТАР. 2-4


ГОМЕЛЬШЧЫНА — У ЛІКУ МІЛЬЁННІКАЎ 6


ТЭЛЕФОНЫ НА ПАЛІЧКУ 10


У ВЫХАДНЫЯ ПРЫПЯЧЭ 16


+TV ПРАГРАМА «ПАДЛЕТКІ Ў СУСВЕЦЕ»

# ВЕЛЬМІ ХУТКА Ў ШКОЛУ!




Дзень 1 верасня знакавы амаль для ўсіх, нават для тых, у каго дзеці ўжо выйшлі са школьнага ўзросту або да яго яшчэ не дараслі. Ёсць жа ўнукі, пляменнікі, суседзі, якія з хваляваннем збіраюцца ў школу, і ты ў любым выпадку сам далучаешся да гэтага свайго роду свяшчэннадзейства. Што ўжо казаць пра бацькоў школьнікаў і пра саміх вучняў! Хваляванне, чаканне, прадчуванне — столькі эмоцый, што за імі часам забываеш пра нешта прыземленае, але вельмі важнае. Асабліва сёлета, калі з першага верасня з уступленнем у сілу абноўленага Кодэкса аб адукацыі так шмат мяняецца ў школьным жыцці...

Не хвалюйцеся, рыхтуйцеся да 1 верасня, жывіце прыемнымі эмоцыямі і прадчуваннямі. Пра ўсе прыземленае і важнае мы раскажам вам у публікацыях двух жнівеньскіх нумароў, якія засталіся. Чытайце, запамінайце, бярыце пад увагу — і добрага вам шляху ў Краіну ведаў!

(Працяг тэмы на стар. 7—10)

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X

25166>

9 771990 763008

# «ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ШТО

## «ТАК, МУЖЫКІ, СПРАВА НЕ ПОЙДЗЕ»

Але, як заўсёды, кіраўнік дзяржавы глядзеў шырэй асноўнай тэмы сваёй рабочай паездкі. Адразу пасля прыбыцця Аляксандр Лукашэнка падрабязна пацікавіўся сітуацыяй у ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» ў кіраўніка гаспадаркі Аляксандра Багеля. Распытаў пра ход уборачнай, ураджайнасць сельгаскультур, жывёлагадоўлю. Пачутым Прэзідэнт застаўся задаволены. «Малайчына, што ў парадак прывёў гаспадарку», — пахваліў ён кіраўніка прадпрыемства.

Знайшлося месца і для крытыкі. У суседніх гаспадарках сітуацыя далёка не такая, як у «Рассвеце». Гаворка зайшла ў тым ліку і аб гаспадарках Мінскай вобласці. «Паміж Чэрвенем і Беразіно (я заўсёды за гэтыя раёны Мінскай вобласці перажываю) — катастрофа. Палі не апрацаваныя. Вось што мяне засмучае», — заўважыў Прэзідэнт. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што гэта такія ж палі, як у «Рассвеце», толькі на іх не працуюць належным чынам, і яны прыходзяць у занялад.

«Начальнікі ў нас, як і ў былыя часы, ездзяць па дарогах. Вось па дарозе едзеш, пры дарогах усё апрацавана, добра — амаль як у «Рассвеце». А далей (я ж бачу: з верталёта ўсё відаць) усё гэтым сумнікам, залатой травой, зарасло. Так, мужыкі, справа не пойдзе», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўспомніў гісторыю «Рассвета». Ён нагадаў, што ў савецкія часы гэта гаспадарка дабілася высокіх вынікаў не толькі па мерках БССР, але і ўсяго Савецкага Саюза. І гэта заслуга першага кіраўніка гаспадаркі — Кірыла Арлоўскага. Яго Прэзідэнт назваў заслужаным чалавекам. «Калі б не ён, такой гаспадаркі б не было», — адзначыў ён.

## «СЯЛЯНЕ СЁННЯ ПРАЦУЮЦЬ ДОБРА»

Перш чым прыступіць да пытання асноўнага, разгледзелі першачарговае — уборачную кампанію ў цэлым па краіне. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый Горлаў далажыў, што на гэты момант убрана збожжавых і зернебабовых з 91 % плошчаў і намалочана 8,4 млн т збожжа з улікам рапсу. З улікам укладу фермерскіх гаспадарак плануецца выйсці на ўраджай у 9 мільёнаў тон, без кукурузы.

Прэзідэнт пацікавіўся, як ідуць справы з уборкай у Віцебскай вобласці, ці хапае тэхнікі. Кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што вобласць спраўляецца. Аляксандр Лукашэнка

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота БелТА

зрабіў акцэнт на культуры земляробства ў Мінскай вобласці і падзяліўся назіраннямі: у раёне ракі Бярэзіны палі застаюцца незааранымі, не дагледжаны вялікія ўчасткі зямлі. Двума словамі — уражанне жудаснае. «Палі наогул незаараныя засталіся. Як я кажу, не ўлезці. Зноў хмызняком зарастуць, і мы гераічна будзем траціць грошы на меліярацыю, каб іх прывесці ў парадак. Таму я вам раю ад дарогі далей на 3—5 кіламетраў ад'ехаць і паглядзець, што там робіцца», — адзначыў беларускі лідар.

Сёлета з-за надвор'я агратэхнічныя тэрміны зрушыліся, і час сяўбы азімага рапсу часткова супаў з уборачнай кампаніяй. Прэзідэнт настойвае, што пасяўную азімага рапсу трэба завяршаць. «Сёлета амаль у тэрмін пасеялі. У тыя гады я бачыў: тыдзень, 10 дзён, маглі да сярэдзіны верасня сеяць. А сёлета сціснутыя тэрміны. І наогул сёлета сяляне працуюць добра (у параўнанні з тымі гадамі). Зразумела, ёсць і добрыя, і дрэнныя, але ў цэлым паглядзець — працуюць нядрэнна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Больш падрабязна пра ўраджай агародніны Прэзідэнт цікавіўся ў кіраўніка КФХ «Дзіяна» Шклоўскага раёна Уладзіміра Маліноўскага. Спецыяліст запэўніў, што ўраджай будзе нядрэнны — не ніжэйшы за ўзровень мінулага года адназначна. Уладзімір Маліноўскі таксама расказаў, што якасць бульбы сёлета будзе нават лепшай, чым летась: было шмат ападкаў, а гэта культура любіць вільгаць.

## «ТАМ, ДЗЕ ТРЭБА ПРЫКЛАСЦІ РУКУ ПРЫВАТНІКУ, — КАЛІ ЛАСКА»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў савецкі час «Рассвет» быў узорна-паказальнай гаспадаркай, маяком. У пачатку 1990-х, як і іншыя перадавыя гаспадаркі, апынуліся не ў лепшым стане, таму, нагадаў Аляксандр Лукашэнка, яму, стаўшы Прэзідэнтам, давялося брацца за адраджэнне падобных перадавых гаспадарак, якіх у краіне тады было 60. Выбар быў зроблены на карысць калгасаў, саўгасаў. Пры гэтым у адладжанай сістэме, якая ўсталявалася, ёсць магчымасць перадаваць, напрыклад, фермерам асобныя землі для вядзення сельскай гаспадаркі.

«Тады мне давялося паказаць: вось гэтым шляхам мы пойдзем — буйнатаварныя гаспадаркі. Але калі хтосьці хоча стаць фермерам — калі ласка, вам зямля. Сёння наогул праблем няма. Бярыце любую гаспадарку. Натуральна, «Рассвет» вам ніхто не аддасць, вы ж разумееце, што тут і бойка будзе яшчэ за гэты «Рассвет» або за землі нейкія. Гэта ж сяляне, нельга тут ламаць, нельга», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння многія, хто просіць даць землі сельгаспрызначэння, хацеў бы мець «вялікія латыфундыі» — займацца буйнатаварнай вытворчасцю, але на прыватным узроўні. «Калі ласка. У нас ёсць. Але адразу кажу, што гаспадаркі, якія добра працуюць (іх большасць), вядома, ніхто не аддасць. Навошта іх ламаць? Працуюць — няхай працуюць. А там, дзе трэба прыкласці руку прыватніку, — калі ласка, будзем падтрымліваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы. І нагадаў усім: на зямлі павінен быць парадак, запушчаных палёў ні ў каго не павінна быць.

## «ГАНДАЛЬ ПАВІНЕН ПАДКЛЮЧЫЦЦА НА ЎСЮ КАТУШКУ»

На мерапрыемства ў «Рассвет» былі запрошаны і вытворцы бульбы — кіраўнікі дзесяці кампаній, якія атрымліваюць 30 % ураджаю краіны, і яго прамысловыя перапрацоўшчыкі. «Я вас спецыяльна запрасіў, каб вы пакрытыкавалі нашых бульбаводаў, асабліва навукоўцаў», — патлумачыў Прэзідэнт.

Вясной гэтага года, як вядома, у гандлі былі праблемы з бульбай. І кіраўнік дзяржавы настойліва раіў павялічыць плошчы пад вырошчванне гэтай культуры. Рашэнне аказалася правільным. Прэзідэнт папярэдзіў, што ў гэтым годзе значны попыт на бульбу можа захавацца, у тым ліку і ў Расіі. Увесну суседзі прадалі нават насенную бульбу, а хутка нарасціць пасяўныя плошчы не атрымаецца. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што і беларускія чыноўнікі прапаноўвалі прадаваць насенную бульбу, але Прэзідэнт катэгарычна адхіліў гэтыя прапановы.






# БУЛЬБЫ Ў БЕЛАРУСІ ДАСТАТКОВА»

**«Я кажу: вы што, з глузду з'ехалі? Ну, пацерпім ужо... Аказваецца, там справа не ў бульбе была, а ў чыіхсьці галовах, якія сёння ў турме сядзяць», — нагадаў ён.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не гандлёвыя сеткі павінны кіраваць вытворцамі, а наадварот. І паставіў задачу стварыць умовы для захоўвання: падрыхтаваць сховішчы для агародніны, закласці стабілізацыйныя фонды, каб потым не аказалася, што нам чагосьці не хапае. І гандаль, паводле яго, «павінен падключацца да гэтага на ўсю катушку». «Хоць, насамрэч, класіка: ты вырабіў, захаваў, прывёз у гандаль, гандаль у цябе ўзяў — прадае. Пакуль у нас так не ўсюды атрымліваецца. Але пытанне трэба вырашыць», — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пацікавіўся наяўнасцю бульбы ў магазінах і яе цаной. Было далажана, што гандаль на 95 % забяспечаны ранняй бульбай, цана ў сярэднім 1,3 беларускіх рубля за кілаграм. Але гэта на раннюю бульбу, пасля яна знізіцца.

## ТРЭБА АРЫЕНТАВАЦЦА НА СВАЁ

Вадзім Махонька, генеральны дырэктар навуковага цэнтра па бульбаводстве і плодаагародніцтве, далажыў пра тое, як ідзе работа над селекцыяй беларускіх сартоў бульбы, якія па ўраджайнасці не горшыя за імпартныя. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, калі ёсць магчымасць купляць імпартныя сарты, нічога дрэннага ў гэтым няма, ды лепш аддаваць перавагу айчынным узорам.

**«Калі ёсць сваё — трэба арыентавацца на сваё. У адваротным выпадку, як нас навучылі заходнікі, калі вароты зачыняцца, будзем разводзіць рукамі. Таму нам трэба арыентавацца на ўласныя сарты. І калі ўласныя па якасці і па прадукцыйнасці, па цане таксама — нармальна, значыць, трэба вырошчваць», — заявіў Прэзідэнт.**

Гэта датычыцца і тых, хто пастаянна працуе з бульбай. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на сетцы рэстаранаў хуткага харчавання Mak.by. «Каб у Mak.by з 1 кастрычніка не было ніводнага кавалка імпартнай бульбы. І катлеты. Там павінна быць беларускае, — распарадзіўся ён. — Што вы гэтую гадасць амерыканскую людзям падсоўваеце?»

Прэзідэнт нагадаў, што, калі амерыканская кампанія сыходзіла з нашага рынку, ніхто не спалохаўся — была задача спраўляцца сваімі сіламі і сваёй прадукцыяй. Яе выканалі. Імпартазамяшчэнне ў Mak.by выканана на 84 %. Выкарыстоўваецца айчынная бульба, усе інгрэдыенты для бургераў, акрамя булачак — яны пакуль імпартныя. Але свая пякарня ўжо будуецца і пачне працаваць з лютага. Тым самым будуць закрытыя гэтыя 16 % па імпартазамяшчэнні. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што ніколі не наведваў рэстараны гэтай сеткі, стравы не каштаваў. І паабяцаў наведаць, калі там усе стравы будуць на 100 % з беларускай прадукцыі.

У цэлым па краіне вырошчваецца 50х50 сартоў бульбы: 50 — айчынных, 50 — імпартных. «Трэба сыходзіць ад імпарту, калі якасць добрая. Ну, і ўраджайнасць каб была», — упэўнены беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што тэсціруе многія айчынныя сарты на асабістым падворку. Напрыклад, нядаўна назіраў, як рос новы сорт «Умка». Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што гэты сорт выклікаў у яго неадназначныя ўражанні. З аднаго боку, сама назва патрабуе яго вырошчваць, а з другога боку, ураджайнасць сёлета не вельмі добрая ў параўнанні з мінулым годам.

Беларускі лідар раскрыў інсайт — у маючы адбыцца візіт у Кітай ён возьме ў падарунак замежным калегам беларускую бульбу. У прыватнасці, такіх сартоў, як «Першацвет», «Брыз», «Гарантыя». Лепшай рэкламы для беларускай бульбы прыдумаць складана.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся меркаваннем вытворцаў аб беларускіх сартах. «Ёсць нармальныя сарты беларускія. Імі таксама трэба займацца»», — заўважыў Уладзімір Маліноўскі.

«То-бок, калі па-чалавечы працаваць, то і беларускія нармальныя?» — удакладніў Прэзідэнт.

«Патрэбна цалкам выконваць тэхналогіі. Тады заўсёды будзе вынік», — адказаў фермер.

На ўгоддзях гаспадаркі «Рассвет» вырошчваюць увесь «набор для баршчу»: цыбулю, буракі, моркву. Прэзідэнт нагадаў, што цыбулю трэба есці для прафілактыкі інфекцыйных захворванняў. А моркву пакаштаваў на смак і ацаніў высока.

## «ТРЭБА БУДАВАЦЬ СХОВІШЧЫ Ў СЯБЕ»

З умовамі захоўвання бульбы Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся ў бульбасховішчы ААТ «Рассвет». У 2024 годзе была праведзена рэканструкцыя. Сховішча адпавядае ўсім стандартам: правільна зроблена вентыляцыя, падтрымліваецца патрэбная тэмпература паветра і ўзровень вільгаці. Маецца лінія па перадрэалізацыйнай апрацоўцы бульбы і фасоўцы. Абсталяванне — беларускай вытворчасці і, па словах спецыялістаў, не саступае імпартнаму. «Не трэба імкнуцца будаваць (сховішчы. — «Зв».) недзе. Вось мы вырабляем, мы закладваем, і мы гатовыя пастаўляць круглы год гэтую прадукцыю», — заўважыў Уладзімір Маліноўскі.

Пра якасць ураджаю бульбы Прэзідэнт пацікавіўся і ў супрацоўнікаў, праз чые рукі бульба праходзіць кожны дзень у прамым сэнсе. Пра захаванасць, якасць бульбы, асаблівасці сартавання ён спытаў у людзей, якія працуюць на сховішчы.

«Глядзіце, каб не было незапоўненых сховішчаў. Гэта злачынства — мець сховішча і не запоўніць», — аб гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў ужо чыноўнікаў і кіраўнікоў гаспадарак.

## БЕЛАРУСКАЯ БУЛЬБА ЎСЮДЫ ЗАЎСЁДЫ ПАТРЭБНАЯ

**Убачанае на полі і ў сховішчы абагульнілі на нарадзе па актуальных пытаннях развіцця бульбаводства. Гаварылі аб вырашчаным ураджаі, уборцы, перапрацоўцы, захоўванні, рэалізацыі і далейшым развіцці падгаліны.**

«Калі ўжо абсалютна шчыра, пытанне не ў тым, хапае ў нас бульбы або не, прадаём дрэнна ці купляем аднекуль. Перш за ўсё сімвалічнае значэнне мае наша сённяшняя сустрэча», — адкрыў нараду кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў свой час сродкі масавай інфармацыі, ды і самі чыноўнікі стварылі праблему з дэфіцытам бульбы. І гэтая тэма набыла істотнае гучанне ў грамадстве.

**«Інфармацыйная вайна ідзе з нарастаючым напалам. І калі не здымаць падобныя сімптомы хваробы — дрэнна будзе ў будучыні. Людзі нашы павінны ведаць, што бульбы, як заўсёды, у Беларусі дастаткова.**

**А сёлета і ў будучыні да новага ўраджаю — больш чым дастаткова», — заявіў беларускі лідар.**

Прэзідэнт звярнуў увагу: па пачатку ўборкі бульбы ўжо відаць, што ўраджайнасць нядрэнная. Фермеры і кіраўнікі гаспадарак запэўніваюць, што нядрэнная і якасць. Ёсць попыт.

«Значыць, як і планавалі вясной, пасеялі на 4,5 тысячы гектараў больш бульбы, чым звычайна, мы не пралічыліся, як у народзе кажуць. Гэта знакавая сельскагаспадарчая культура для нас. Яна ўзведзена ў ранг нацыянальнага прадукту», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што ў часы СССР нас нездарма жартам празвалі бульбашамі. Беларусь хоць і займала тады трэцяе месца па аб'ёмах вытворчасці гэтай культуры пасля Расіі і Украіны (у іх бульба апрацоўваўся на большай колькасці гектараў), але спажывала і спажывае цяпер больш за ўсіх не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў свеце. Прэзідэнт прывёў лічбы: «160 кілаграмаў на брата ў год, а то і 180 было». Нездарма кніга «500 страў з бульбы» была настольнай у кожнай беларускай гаспадыні і перадавалася ў спадчыну, заўважыў беларускі лідар.

**«Пры такой любові да бульбы мы, вядома, заўсёды ўмелі яе апрацоўваць, вырошчваць. Як у сельгасарганізацыях, так і на асабістых участках. І да гэтага часу, калі ў кагосьці ёсць кавалак зямлі, то клапатлівы, добры гаспадар абавязкова градку-другую вырошчвае бульбы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

І распавёў, што на сваім участку вырошчвае бульбу айчыннай селекцыі, разам са спецыялістамі Акадэміі навук праводзіць своеасаблівы эксперымент. Прэзідэнт расказаў, што часта дорыць беларускую бульбу замежным калегам і яна карыстаецца папулярнасцю на постсавецкай прасторы і ў больш далёкіх краінах. «Таму беларуская бульба ўсюды заўсёды патрэбная. І ў якасці падарунка, і для харчавання», — нагадаў прапісную ісціну кіраўнік дзяржавы.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*





# «ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ШТО БУЛЬБЫ Ў БЕЛАРУСІ ДАСТАТКОВА»

## НЯМА НІЯКІХ ПРАБЛЕМ НАРМАЛЬНА ЗАХОЎВАЦЬ БУЛЬБУ

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на захоўванне бульбы — у гэтым пытанні, паводле яго слоў, нічога складанага. «Няма ніякіх праблем у тым, каб пабудаваць у Беларусі патрэбную колькасць сховішчаў і нармальна захаваць бульбу і «набор для баршчу» ўвесь», — заявіў Прэзідэнт.

Акцэнт на захоўванне бульбы невыпадковы, тым больш што сёлета яе шмат. «Памяшканняў хапае. Проста трэба страсянуць людзей, каб яны забяспечылі захоўванне бульбы. І не толькі бульбы — нам жа і буракі патрэбныя, і цыбуля. Трэба моркву, трэба капусту пэўны перыяд захаваць. Нам трэба па-гаспадарску падыходзіць. Прыйшоў час. Калі апярэдзім у былым Савецкім Саюзе іншых — будзем з грашыма, як фермеры кажуць, будзем мець нейкую капейку. Калі праспім гэты час — быць бядзе. Сёння момант», — заявіў Прэзідэнт.

## БЕЛАРУСЫ ПАВІННЫ МЕЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ КУПІЦЬ БЕЛАРУСКУЮ БУЛЬБУ

Спецыялісты запэўніваюць: у грамадскім сектары сёлета збяром мільён тон бульбы (што на трэць больш, чым летась). А разам з пасаджанай на ўчастках можа атрымацца 3,5 мільёна тон! «Гэта дасць магчымасць не толькі цалкам забяспечыць сябе, але і экспартаваць. Мінулая вясна паказала, што наша бульба на знешніх рынках ідзе нарасхват. Даходзіла да ажыятажнага попыту, і нібыта ў нас былі пустыя паліцы ў крамах. Ураду даручана было прыняць усе меры, каб сітуацыя не паўтарылася. Беларусы ўвесь год павінны мець магчымасць купіць беларускую бульбу (ну, і ўвесь «набор для баршчу»: буракі, цыбулю, моркву, капусту) па прымальнай цане. Хацелася, каб урад і губернатары гэта пачулі і мы больш да гэтага не вярталіся», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы агучыў важны пасыл для кіраўнікоў рытэйлаў: «Звяртаю ўвагу кіраўнікоў гандлёвых сетак, што адсутнасць у магазінах якаснай даступнай айчыннай бульбы будзе мець сумныя наступствы».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і не трэба бяздумна мыць усю бульбу: кожны селянін ведае, што мытая доўга не захоўваецца. І калі памыць занадта шмат, то можна проста яе выкінуць. Таму пасыл нязменны: па-гаспадарску трэба падыходзіць да захоўвання. Як гэта рабіць — добра вядома.

«З прыярытэтамі рэалізацыі вызначыліся. На сёння галоўная задача — убраць ураджай і захаваць яго», — акцэнтаваў Прэзідэнт. Ён пацікавіўся, ці хапае ў краіне сховішчаў, у тым ліку і для насеннага фонду. «І звярніце самую пільную ўвагу на якасць клубняў, якія ідуць у закладку на міжсезонне. Калі не вытрымаць лячэбны перыяд, нічога захоўваць не будзе. А гэта наш залаты запас. Прычым не толькі харчовы, але, як паказала практыка апошніх гадоў, і валютны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Можа, варта нейкую колькасць бульбы максімальна перапрацаваць, пакласці ў сухім выглядзе: пюрэ, крухмал, чыпсы і гэтак далей. Палічыце, колькі трэба замарожанай бульбы для фры, каб забяспечыць, напрыклад, той жа Mak.by».

## ТРЭБА ЗРАБІЦЬ НАРМАЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ СОРТ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры Нацыянальнай акадэміі навук працуе цэлы інстытут бульбаводства. «Скарб», «Маніфест», «Ласунак», «Брыз», «Першацвет» — папулярныя сарты. Цяпер экзотыка пайшла: той жа «Сапфір» з карысной фіялетавай мякаццю многія ведаюць і любяць. Але, звярнуў увагу беларускі лідар, людзі цяпер больш аддаюць перавагу класічным сартам. Значыць, трэба прапаноўваць тое, што любяць людзі.

**«Але спыняцца на дасягнутым нельга. Нашы навукоўцы могуць і павінны пастаянна паляпшаць лінейкі айчынных высокапрадукцыйных сартоў, рабіць іх устойлівымі да хвароб і неспрыяльных умоў надвор'я», — паставіў задачу Прэзідэнт.**

І пацікавіўся, куды мы рухаемся ў гэтым напрамку, у рабоце з сартамі, сортаабменам, ці выбудаваная сістэма.

«Сёлета вясной былі шматразовыя замаразкі, усё лета — заліўныя дажджы, а потым — ранні туман, фітафтора. Ці ёсць у нас сарты, аднолькава ўстойлівыя да фітафтарозу, паршы, драцяніку?

**Трэба зрабіць нармальны сорт. Ганьба для навукоўцаў, калі ў Беларусі не будзе добрага, нармальнага сорту. Што хочаце рабіце: запазычвайце ў суседзяў, у немцаў, у французаў, у каго заўгодна», — даў яшчэ адно даручэнне кіраўнік дзяржавы.**

## ГОД БЫЎ НЯПРОСТЫ, АЛЕ ЎРАДЖАЙ ГОДНЫ

Уборачная кампанія ў самым разгары. Вы звярнуў увагу Прэзідэнт, усё, пра што прасіў урад, зроблена. «Цяпер вынік залежыць ад вас. Паралельна з бульбай ідзе ўборка буракоў (у тым ліку цукровых), кукурузы на зерне, капусты, морквы. Год быў няпросты, але, паўтараюся, ураджай на палях вырасцілі годны. Трэба яго сабраць і захаваць», — заявіў беларускі лідар і заклікаў не замоўчваць праблемы, калі яны ёсць.

З дакладам выступіў профільны віцэ-прэм'ер Юрый Шулейка. Ён расказаў, як будзе размеркаваны мільён тон бульбы, атрыманы ў грамадскім сектары, гэта значыць у вытворцаў. 200 тысяч тон пойдзе ў насенны фонд, 200 тысяч тон — на розную перапрацоўку, чыпсы, крухмал і іншыя прадукты. Прыблізна 45 тысяч тон будзе прададзена на кірмашах, амаль 60 тысяч тон — у стабілізацыйныя фонды. Таксама віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў стабілізацыйныя фонды будзе закладзены ўвесь «набор для баршчу»: цыбуля, морква, буракі, капуста — гэтай агародніны сёлета дастаткова.

Прэзідэнт актыўна цікавіўся меркаваннем вытворцаў, пытаўся аб іх супрацоўніцтве з гандлёвымі сеткамі. «Давайце дамовімся так: дагавор, які вы заключыце з сеткамі (і наогул, з кім бы вы ні заключылі ў Беларусі)... Што ў дагаворы напісана — тое і будзе выконвацца. Вы паабяцалі аб'ём паставіць — вы абавязаны паставіць. Вы паабяцалі па такой цане — па такой цане пастаўляйце. А яны абавязаны ў вас па гэтай цане забраць, з кім вы дамовіліся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся і да вытворцаў, і да прадстаўнікоў гандлю. Паводле яго слоў, так будзе прасцей працаваць усім бакам і будзе прасцей вырашаць праблемныя пытанні, калі яны ўзнікнуць.

«Давайце будзем працаваць па-чалавечы, разумеючы, што людзей трэба забяспечыць. Не хацелася б кіраваць дыктатарскім чынам, аўтарытарным, але часам не атрымліваецца. І давайце лепш будзем працаваць мірна, чым ваявацъ», — звярнуўся да ўсіх адказных кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Кіраўскі раён.*

## Даслоўна

### ПАВІННА ЗАХОЎВАЦЦА СУВЯЗЬ НАВУКІ І ВЫТВОРЦАЎ

Вынікі рабочай паездкі Прэзідэнта ў размове з журналістамі падвёў **дырэктар ААТ «Рассвет» Аляксандр БАГЕЛЬ**. «Было шмат размовы пра бульбу, насенняводства і наогул, як гэтай галіне існаваць, вырашаны пытанні з навукай. Прэзідэнтам было дадзена даручэнне распрацаваць такія сарты, якія не саступалі б імпартным. І самае галоўнае — павінна захоўвацца сувязь навукі з вытворчасцю, каб гэтыя сарты пайшлі ў вытворчасць, пайшлі на беларускі рынак, каб яны былі канкурэнтаздольныя ў адносінах да імпартных. Гэта абсалютна рэальна», — адзначыў ён.

Аляксандр Багель таксама падкрэсліў, што ішла сур'ёзная размова аб супрацоўніцтве вытворцаў з гандлёвымі сеткамі. «Цяпер ужо будуць заключацца дагаворы, якія вызначаць абавязкі абодвух бакоў. Гэта значыць, вытворца абавязаны вырабіць, а гандлёвыя сеткі закупіць паводле дагавора. Цэнаўтварэнне ў гэтым выпадку ў нейкім выглядзе будзе і ўрад рэгуляваць, каб не было спрэчак», — расказаў ён.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 | |
| **Продавец** | ОАО «Василишки», Гродненская область, Щучинский р-н, аг. Василишки, ул. Советская, д. 30. УНН 500000242 | |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф.1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** | |
| **Предмет электронных торгов** | | |
| Лот № | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
| 1 | **Трактор «Беларус-1221», СК-4 9797**, 2008 г. в. | **45 579,83** |
| 2 | **Трактор МТЗ 1221.2, СВ 2603,** 2010 г. в. | **52 545,12** |
| 3 | **Трактор «Беларус-82.1», СВ-4 1498,** 2010 г. в. | **25 783,77** |
| 4 | **Трактор «Беларус-82.1», СВ 4 1479,** 2009 г. в. | **25 539,37** |
| 5 | **Комбайн зерноуборочный КЗС-1218 СВ-4 5928 с жаткой для зерновых культур ЖЗК 7-2 и тележкой**, 2011 г. в. | **48 879,18** |

**Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота.**
**Месторасположение – Гродненская область, Щучинский р-н: лоты №№ 1, 5 – аг. Василишки, ул. Лидская, 29, лоты №№ 2–4 – аг. Бакшты, мех двор**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** от даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 30.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Старобинский»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

Лот 1: **административное здание**

**с инв. № 644/С-57945 общ. пл. 231,7 кв. м,**

**расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625086202501000268 (право постоянного пользования) площадью 0,2191 га, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Саковичи, ул. Залужная, 2В**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (0,2191 га), охранная зона электрических сетей (0,0063 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **22 560,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2256,00** бел. руб.

Лот 2: **здание бани**

**с инв. № 644/С-61090 общ. пл. 125,8 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625086202501000286 (право постоянного пользования) площадью 0,3120 га, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Саковичи, ул. Коммунальная, 23.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (0,3210 га), охранная зона электрических сетей (0,0187 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **10 200,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1020,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **30.09.2025** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 044 720 65 05.**

УНП 600071171

УЗРОВЕНЬ

# ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ РОСТ І ПАВЫШЭННЕ ЗАРПЛАТЫ

## З якімі вынікамі Мінск завяршыў першае паўгоддзе



Фота БелТА.

Сталіца па выніках першага паўгоддзя выканала ўсе даведзеныя ўрадам паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Аб гэтым падчас пасяджэння Мінскага гарвыканкама заявіла першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ, паведаміла БелТА.

«У нас добрая дынаміка па інвестыцыях у асноўны капітал — звыш 113 %. Мы выканалі паказчыкі па росце заработнай платы — 115 %. Таксама станоўчая дынаміка па рознічным тавараабароце: на сталіцу прыпадае больш за 50 % рэспубліканскага аб'ёму. Сектар грамадскага харчавання стаў адным з драйвераў росту», — адзначыла Надзея Лазарэвіч.

Разам з тым яна падкрэсліла, што пры станоўчых выніках застаюцца і праблемныя пытанні. «Мы бачым зніжэнне дынамікі ў апрацоўчай прамысловасці. Калі ў пачатку года тэмп росту складаў 111 %, то цяпер — 99,5 %. Акрамя таго, упершыню за 10 гадоў назіраецца рост складскіх астаткаў. Гэта замарожаныя рэсурсы прадпрыемстваў, што вядзе да падзення аб'ёмаў вытворчасці і росту крэдытнай нагрузкі. Мы запрасілі кіраўнікоў буйных прамысловых прадпрыемстваў рэспубліканскай формы справаздачнасці, у тым ліку лёгкай прамысловасці і «Белдзяржхарчпрама», каб дэталёва разабраць сітуацыю і намеціць меры па выхаду з яе», — адзначыла першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама.

Надзея Лазарэвіч звярнула ўвагу, што ў той жа час прадпрыемствы бязведамаснай формы справаздачнасці дэманструюць высокія паказчыкі: «У экспарце тавараў і паслуг менавіта яны забяспечылі больш за 80 % аб'ёму. Прыватны бізнес актыўна працуе, экспартуе, і гэта пацвярджае наяўнасць попыту на нашу прадукцыю і паслугі. Значыць, пытанні, з якімі сутыкаюцца рэспубліканскія прадпрыемствы, маюць унутраны характар і патрабуюць канкрэтных рашэнняў».

«Трымаць на пастаянным кантролі выкананне прагнозных паказчыкаў — гэта значыць валодаць той сітуацыяй, якая адбываецца ў горадзе. Мы разумеем, што ад эфектыўнай работы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў горада залежаць фарміраванне бюджэту і рэалізацыя тых задач, якія стаяць сёння. Гэта найперш эканоміка краіны ў цэлым, — падкрэсліла **Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па Мінску Наталля КАЧАНАВА**. — Са свайго боку я акцэнтавала ўвагу прысутных на пасяджэнні выканкама кіраўнікоў па выкананні тых задач, якія пастаўлены кіраўніком дзяржавы ў развіццё нарады, якая адбылася на гэтым тыдні: аб гандлёвым забеспячэнні нашых грамадзян, аб сістэме аховы здароўя. Прэзідэнтам дакладна пастаўлена задача, што 1 студзеня 2026 года такіх праблем у нашага насельніцтва быць не павінна. Таму, вядома, трэба ўсім уключыцца ў гэтую работу».


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного электронного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

**Гродненскому областному потребительскому обществу (филиал «Центральный рынок»)**

**Аукцион состоится 12.09.2025 г. в 11.00 по адресу: https://gostorg.by Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: грузовой автомобиль RENAULT MAXITY 150, гос. № АН 3211-4, 2007 г. в., цвет – синий, разрешенная масса 4500 кг, тип топлива – дизель, объем двигателя 2953 куб. см, мощность – 150 л. с.,/110kv; № кузова VF6SFTF2471019044, пробег 574 388 км |
| **Обременения** | Нет |
| **Начальная цена продажи** | **Лот № 1:** 18 700 руб. (восемнадцать тысяч семьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **Лот № 1:** 1870 руб. (одна тысяча восемьсот семьдесят рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Шаг электронных торгов** | 5 % |
| **Адрес и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются на сайте ЭТП https://gostorg.by **Последний день приема заявлений – 10.09.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.06.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://gostorg.by | |


У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

# У ГРОДНЕ ГАВАРЫЛІ ПРА ЭКАНОМІКУ

## Сустрэчы ў рамках акцыі «Беларусь адзіная» ў кожным горадзе маюць сваю спецыфіку

На сустрэчы ў Гродне абмеркавалі ключавыя пытанні рэгіянальнага развіцця і будучыні краіны. Удзельнікі закранулі важныя аспекты, такія як эканамічная палітыка, ваенная бяспека і сацыяльнае адзінства. Спікерамі сустрэчы сталі старшыня праўлення РДГА «Беларускае таварыства «Веды» дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН, аналітык БІСД Аляксей АЎДОНІН і член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Міхаіл АКСЯНЮК. Дыялог адбыўся на базе ГрДУ імя Янкі Купалы.




Вадзім Гігін падкрэсліў, што кожная рэгіянальная размова мае свае асаблівасці. Важна, каб сустрэчы ў розных гарадах праходзілі не па шаблоне, а з улікам асаблівасцяў кожнага рэгіёна. Калі ў Мінскай вобласці абмяркоўвалі ў большай ступені палітычныя і ваенныя пытанні, то ў Гродне акцэнт быў зроблены на эканоміку. Гэта абумоўлена не толькі спецыфікай рэгіёна, але і спікерамі. Так, Аляксей Аўдонін прадставіў аналіз рэгіянальнага аспекту развіцця Гродзенскай вобласці.

— Зaўсёды прыемна апынуцца ў Гродне. Сустрэчы тут праходзяць адкрыта і шчыра, настройваючы на прамы дыялог з аўдыторыяй. Нягледзячы на розную тэматыку, ёсць агульная тэндэнцыя. Асаблівую ўвагу ўдзяляем новым тэхналогіям і метадычным падыходам. Выкарыстоўваем элементы штучнага інтэлекту і чат-боты, што робіць узаемадзеянне з аўдыторыяй больш разнастайным і эфектыўным. Гэта дазваляе маштабаваць паспяховыя практыкі і працягваць найлепшыя напрацоўкі публічных сустрэч, — расказаў Вадзім Гігін. — Напрыклад, маштабная грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства» паказала, што сучасныя тэхналогіі камунікацыі могуць быць вельмі эфектыўнымі. Яны даюць магчымасць наладзіць якасную зваротную сувязь паміж прадстаўнікамі ўлады і грамадствам.

Як падкрэсліў Аляксей Аўдонін, важнасць эканамічнай стабільнасці і развіцця ва ўмовах зменлівай сусветнай абстаноўкі нельга адмаўляць. Ён адзначыў, што эканоміка з'яўляецца асновай будучага краіны і яе развіццё павінна быць прыярытэтным кірункам. Спікер таксама звярнуў увагу на бягучую сітуацыю ў сусветнай эканоміцы і палітыцы.

— Мы бачым, што ў апошнія гады ўспрыманне людзей змянілася. І гэта не наша прапаганда, а тая статыстыка, якая ідзе ад Еўрасаюза. У большай ступені гэта звязана з тым, што на пэўным этапе палітычныя сілы прынялі няправільнае рашэнне, яны пайшлі на поваdзе англасаксонскай эліты. Вялікабрытанія і ЗША адвязалі сябе ад Расіі, ад расійскага рынку, ад рынку Саюзнай дзяржавы. Аднак буйныя карпаратыўныя эліты ў Еўропе ўжо ўсведамляюць неабходнасць узнаўлення адносін з Беларуссю і Расіяй.

Важна разумець бягучыя выклікі і знаходзіць шляхі іх пераадолення, каб забяспечыць росквіт грамадства. Моладзь, як адна з ключавых аўдыторый, актыўна ўдзельнічала ў абмеркаванні. Маладыя людзі будуюць сваё жыццё ў Беларусі і жадаюць бачыць яго паспяховым і квітнеючым. Такія сустрэчы яшчэ раз дэманструюць, што грамадзян хочуць слухаць.

Нагадваем, што рэспубліканская інфармацыйна-асветніцкая акцыя «Беларусь адзіная» традыцыйна праходзіць па ўсёй краіне напярэдадні 17 верасня — Дня народнага адзінства. У гэтым годзе яна стартавала 26 жніўня і скончыцца 12 верасня.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ
акционеров открытого акционерного общества
**«Минсктелекомстрой»**
о проведении внеочередного общего собрания акционеров

Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» (далее – Общество), место нахождения: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, извещает, что **10 сентября 2025 г. в 16.00** по адресу: **г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, каб. 326** состоится внеочередное общее собрание акционеров Общества (далее – собрание акционеров). Форма проведения собрания акционеров – очная.

**Повестка дня:**

1) Об утверждении договора о присоединении открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой» и открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ» к открытому акционерному обществу «Белсвязьстрой».

2) Об утверждении передаточного акта открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой».

Предложения в повестку дня собрания акционеров принимаются с 28 августа 2025 г. и не позднее 2 сентября 2025 г.

Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, – 27 августа 2025 г.

Собрание акционеров созывается по решению наблюдательного совета Общества (основание: протокол от 27 августа 2025 г. № 111).

С материалами, подготовленными к собранию акционеров, можно ознакомиться с 28 августа 2025 г. по 9 сентября 2025 г. включительно в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 15.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет юрисконсульта, и в день проведения собрания акционеров – по месту проведения собрания с 14.00 до 15.40. Подготовленная к собранию акционеров информация (документы) предоставляется для ознакомления в виде проектов и копий документов. Фото- и (или) видеофиксация информации (документов), ее ксерокопирование либо фиксация ее содержания иным образом, вынос информации (документов) за пределы места ознакомления с ней не допускаются.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, проводится 10 сентября 2025 г. по месту проведения собрания акционеров с 14.00 до 15.40.

Лица, имеющие право на участие в собрании акционеров, при ознакомлении с материалами, подготовленными к собранию акционеров, и при регистрации обязаны представить: физическое лицо – документ, удостоверяющий личность; руководитель юридического лица – документ, удостоверяющий личность, а также оригинал или надлежащим образом удостоверенную копию документа, подтверждающего полномочия руководителя; представитель акционера – документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности. Общество вправе изготовить копии с представленных лицами, имеющими право на участие в собрании акционеров, документов (за исключением документов, удостоверяющих личность), подтверждающих полномочия руководителя юридического лица, полномочия представителя акционера, и удостоверить соответствие копий таких документов представленным оригиналам.

УНП 100068131



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**ООО «АВКОМ СИСТЕМ»** (УНП 192745581),
объявляет о проведении **15.09.2025 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrot-torg.by.

Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrot-torg.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белбакалея», г. Минск, ул. Промышленная, 15. УНП 100025653 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов:**
бывшее в употреблении имущество

**Грузопассажирский фургон CITROEN BERLINGO, AI 7955-7,** 2010 г. в.
Местоположение: г. Минск, ул. Промышленная, д. 15

**Начальная цена с НДС 20 % – 10 272,00 бел. руб.**
(снижена на 20 %)
***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 09.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ
ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Щучинагрохимсервис». Гродненская обл., г. Щучин, ул. Ленина, д. 37. УНП 500031747 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лесопильная линия ATL-4 LarMET (Латвия),**
2017 г. в., инв. № 00015054.
Местонахождение: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Лещанка, ул. Молодежная, д. 5

**Начальная цена, с НДС 20 % – 409 025,39 бел. руб. (снижена на 20 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 12.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by**

# ЯШЧЭ АДЗІН МІЛЬЁН

## Да рэгіёнаў-мільённікаў на жніве далучылася Гомельшчына

Аграрыі Гомельскай вобласці перасягнулі рубеж 1 млн т намалочанага збожжа на жніве-2025, паведамляе БелТА. У рэгіёне ўжо ўбралі звыш 95 працэнтаў плошчаў збожжавых, зернебабовых культур і рапсу — 348 тысяч га. «Валавы збор склаў мільён тон», — адзначылі ў аблвыканкаме.

Як расказаў старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Анатоль Гапонік, важкі каравай удалося атрымаць дзякуючы зладжанасці работнікаў сельгаспрадпрыемстваў вобласці. «Хацелася б падзякаваць усім аграрыям рэгіёна за плённую працу ва ўборцы культур», — сказаў ён.

Руплівцы палёў працуюць увесь светлавы дзень. Практычна ўсе раёны завяршаюць уборку збожжавых. «У нас на сёння засталося каля 11 тыс. га да ўборкі збожжавых, зернебабовых культур. Плюс грэчка і проса. Адпаведна каравай Гомельскай вобласці яшчэ павялічыцца», — дадаў Анатоль Гапонік. Таксама на чарзе — уборка кукурузы..



Фота БелТА.

# ПАЎНОЧНЫЯ АГРАРЫІ НАРОШЧВАЮЦЬ ТЭМПЫ

## По стане на раніцу 28 жніўня ў Віцебскай вобласці ўбралі 73 % плошчаў збожжавых і зернебабовых

Уборачная гэтага сезона, да якой сельскія гаспадаркі паўночнага рэгіёна масава прыступілі ў апошняй дэкадзе ліпеня, зацягнулася больш як на месяц. На гэта ёсць важкая прычына — летнія дажджы занадта пераўвільгатнілі глебу. На пачатку жніва карціна была прыкрая: калоссе налілося, паспела, але цяжкая сельскагаспадарчая тэхніка загразала на палях. Працавалі збожжаўборачныя машыны на гусенічнай і паўгусенічнай хадзе. Дарэчы, у самыя «мокрыя» паўночныя і паўночна-заходнія раёны вобласці — Верхнядзвінскі, Глыбоцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі — у дапамогу перакідвалі ад шасці да дзесяці адзінак тэхнікі на гусенічнай хадзе з іншых абласцей. Так выручалі таварышаў. Астатнія камбайны вымушаны былі чакаць, пакуль падсохне, у гаспадарках былі створаны спецыяльныя тэхатрады, каб выцягваць тэхніку, якая забуксавала.

— Як толькі надвор'е стабілізавалася, сельгаспрадпрыемствы адчувальна нарошчвалі тэмпы ўборкі, — адзначыў **начальнік упраўлення раслінаводства аблсельгасхарча Віталь ВАРАБ'ЁЎ.** — Пагоднымі днямі на палях шчыравалі да 900 камбайнаў. За штурваламі — надзейныя, правераныя людзі, якім не трэба тлумачыць, што яны закладваюць харчовую бяспеку краіны, дабрабыт сваіх прадпрыемстваў. Мужчыны, а на жніве занята пераважна моцная палавіна, працуюць з поўнай самаадданай і за штурваламі, і на адвозцы зерня, і на сушыльных комплексах.

Імёны лідараў — камбайнераў, механізатараў, вадзіцеляў з вясковымі каранямі, значным стажам, прадстаўнікоў працоўных дынастый — добра вядомыя на Віцебшчыне. Сярод іх Аляксандр Зябко з Чашніцкага раёна і Уладзіслаў Карпушонак з Аршанскага. Правафланговым, першым у вобласці намалаціўшы тры тысячы тон збожжа, з'яўляецца Максім Сярноў з агракамбіната «Юбілейны» Аршанскага раёна (*на фота*). Наступаюць на пяты старэйшым таварышам маладыя камбайнеры Яўген Кухараў з Віцебскага раёна і Арцём Саратокін з Дубровенскага.

— Важкі намалот там, дзе добра вырасла, — падкрэсліў Віталь Вараб'ёў. — Сярэдняя ўраджайнасць па вобласці складае 33,7 ц/га, у той жа час у Аршанскім раёне — 48,6 ц/га, Віцебскім — 44 ц/га, Дубровенскім — 38 ц/га. Сярод асобных гаспадарак вылучаюцца СФГ «Пшанічны двор» Бешанковіцкага раёна, дзе ўраджайнасць збожжа дасягнула 88,9 ц/га, і СВК «Ларынаўка» Аршанскага раёна — 73,1 ц/га.

**Агульны намалот па паўночным рэгіёне цяпер складае 706 тысяч тон зерня, і аграрыі маюць шанцы дасягнуць валавога збору збожжавых і рапсу ў 1 млн тон, як і планавалі. Толькі б зноў не пайшлі дажджы.**

Віцебшчына імкнецца выканаць дзяржаўны заказ на збожжа. На дадзены момант гэты паказчык дасягнуў 64 %. Дзяржзаказ на рапс закрыты на 95 %, дзесяць раёнаў выканалі яго поўнасцю, астатнія закрыюць у найбліжэйшыя дні.

Паралельна з уборкай збожжавых руплівцы вядуць яшчэ адно «жніво» — цярэбяць лён. Церабленне выйшла на фінішную прамую, гэта культура ўбрана на плошчы амаль 11 тыс. га, што складае 85 % ад плану. Нарыхтавана 7,8 тыс. тон неблагой ільнотрасты, сярэднім нумарам 0,93.





І тут жа — закладка падмурку пад ураджай наступнага года. На плошчы больш як 52 тысячы га пасеяны азімыя рапс, прыступілі да сяўбы азімых збожжавых, пад гэтыя культуры ўзарана 84 тыс. га палеткаў.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
**фота «Аршанская газета».**

# ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ГАТОВЫ

## Пашпарты гатоўнасці атрымалі ўсе школы краіны

Гэты дакумент — не толькі «дабро» ад прадстаўнікоў сілавых структур і сістэмы аховы здароўя. Іх ацэнка, безумоўна, мае вырашальную ролю, таму што бяспека і здароўе дзяцей — галоўны клопат не толькі бацькоў і педагогаў, але і грамадства ў цэлым. Пашпарт гатоўнасці мае на ўвазе комплексную гатоўнасць установы — улічваецца стан матэрыяльна-тэхнічнай базы, будынкаў і збудаванняў, укамплектаванасць мэбляй, педагагічнымі кадрамі, наяўнасць навучальных дапаможнікаў, праграмна-планавай дакументацыі і іншага.

### НОВЫЯ ШКОЛЫ І МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

— Сёння хачу з упэўненасцю сказаць, што сістэма агульнай сярэдняй адукацыі гатовая як да прыёму вучняў, так і да якаснай арганізацыі адукацыйнага працэсу, — канстатавала **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.**

Паводле яе слоў, у новым навучальным годзе школьнікаў прымуць 2629 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, сярод іх 17 устаноў іншых ведамстваў: Сувораўскае вучылішча, спецыялізаваныя ліцэі МУС і МНС, сярэдняя школа вучылішча алімпійскага рэзерву, установы адукацыі, якія падпарадкаваны Міністэрству культуры. Да заняткаў прыступіць больш за 1 млн навучэнцаў, з іх каля 90 тысяч — першакласнікі.

— У 2025 годзе запланаваны ўвод у эксплуатацыю 7 школ на 5238 месцаў, — сказала Ірына Каржова. — Геаграфія новабудоўляў шырокая — гэта школы ў Лунінцы і Пінску Брэсцкай вобласці, школа ў Астраўцы Гродзенскай вобласці, у сталічным рэгіёне адкрыецца адразу тры школы — у Фаніпалі, Слуцку і ў вёсцы Ляскоўка Бараўлянскага сельсавета. Вялікая школа адкрыецца і ў Мінску.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ўжо прыступілі да работы 3050 маладых спецыялістаў.

### АЎТОБУС У ШКОЛУ ДАВЯЗЕ

З першага верасня бясплатная перавозка будзе арганізавана для больш як 55 тысяч навучэнцаў. Працягваецца абнаўленне парку школьных аўтобусаў. У 2025 годзе запланавана цэнтралізаваная закупка 237 аўтобусаў, 14 з іх будуць з пад'ёмнымі прыладамі — для перавозкі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. На сёння да перавозак дзяцей гатовы 168 транспартных сродкаў, астатнія 69 аўтобусаў будуць набыты да канца 2025 года.

### НОВЫЯ ПАДРУЧНІКІ І НОВЫ ПРАДМЕТ

Да новага навучальнага года Міністэрствам адукацыі падрыхтавана два новыя падручнікі — «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для трэцяга класа і «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі».

— У дзяцей у раскладзе новы навучальны прадмет, — расказвае начальнік упраўлення. — Адзінаццацікласнікі будуць вывучаць «Гісторыю Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». Летась з ім знаёміліся вучні 10 класа, сёлета ўжо будуць вывучаць школьнікі 10-11 класаў.

### З ПЕРШАГА ПА АДЗІНАЦЦАТЫ

Прыйшоўшы ў школу ў 6 гадоў, дзіця праводзіць у ёй 11 гадоў. Ва ўстанове атрымлівае веды, уменні і навыкі па прадметах. Так і павінна быць.

— На сваёй ступені мы рыхтуем будучага спецыяліста, які пры выпуску са школы павінен валодаць пэўнымі ведамі, — дзеліцца Ірына Каржова. — Але пры гэтым ён яшчэ павінен быць і здаровым чалавекам, таму асобную і пільную ўвагу ў адукацыйным працэсе мы ўдзяляем тэхналогіям, якія дапамагаюць зберагчы здароўе школьнікам. Аснова гэтых тэхналогій — рухальная актыўнасць дзіцяці. І такі прадмет, як «Фізічная культура і здароўе» найлепш гэтаму спрыяе, таму ў раскладзе ўсіх школьнікаў, з 1 па 11 класы, з'явяцца тры (замест двух) урокі фізічнай культуры і здароўя.

— Сказаць, што гэта рэвалюцыйнае новаўвядзенне, нельга, — тлумачыць спецыяліст Мінадукацыі. — У нас летась было 2 урокі фізкультуры абавязковых і адзін — рэкамендаваны, у якасці гадзіны здароўя і спорту. Але слова «рэкамендаваны» расхалоджвала: калі неабавязкова,то можна і прапусціць... Дадаўшы трэці ўрок у расклад, мы знялі ўсе магчымыя дыскусіі з нагоды ўрока «Фізічная культура і здароўе».

### ВЫЗВАЛЕНЫ ПА СТАНЕ ЗДАРОЎЯ

Наступнае новаўвядзенне датычыцца цэнтралізаванага экзамену. У 2025 годзе па медыцынскіх паказаннях вызваляліся ад экзаменаў толькі вучні 9-х класаў.

— Але час і пэўныя сітуацыі паказалі, што гэту норму трэба ўводзіць і для 11-класнікаў, — дзеліцца Ірына Каржова. — Мы яе ўвялі. Аднак хачу звярнуць увагу будучых выпускнікоў і іх бацькоў — калі школьнікі ў надыходзячым навучальным годзе вызваляюцца ад цэнтралізаванага экзамену, а форма ЦЭ такая ж, як і правядзенне ЦТ, то ў 2026 годзе яны не змогуць удзельнічаць ва ўступнай кампаніі ў ВНУ. Ім выдадуць атэстат з гадавымі адзнакамі.

### НАСТАЎНІК — ПРЫКЛАД ДЛЯ ВУЧНЯЎ

Пастановай Міністэрства адукацыі абмяжоўваецца магчымасць выкарыстання ва ўстановах адукацыі мабільных тэлефонаў.

— Дакумент быў прыняты не спантанна, — расказвае начальнік упраўлення. — Да яго падыходзілі свядома, і раней уводзілі абмежаванне на карыстанне гаджэтамі падчас урокаў — тады дзеці здавалі мабільны тэлефон у пачатку ўрока, пасля званка — атрымлівалі назад. На перапынках школьнікі «наганяліі ўпушчанае», седзячы ў сваіх мабільніках. Яны нават паміж сабой размаўлялі з дапамогай СМС-паведамленняў.

Школьным дварам і калідорам вырашылі вярнуць ранейшы звонкі гоман, гульні і шумную дзіцячую мітусню. Было прынята і замацавана нормай рашэнне аб тым, што, прыходзячы ў школу ў пачатку навучальнага дня, дзеці здаюць мабільныя тэлефоны, а па завяршэнні ўсіх заняткаў іх ім вяртаюць.

— Ва ўсіх установах адукацыі ўжо сфарміраваны або арганізаваны месцы захоўвання мабільных тэлефонаў, — тлумачыць спецыяліст Мінадукацыі. — Нейкай агульнай сістэмы пакуль не выпрацавана. Дзесьці мабільнікі будуць захоўвацца ў настаўніцкіх, дзесьці — у рэкрэацыі, каля ўваходу ва ўстановы адукацыі. Як правіла, гэта шафы з ячэйкамі, куды змяшчаюцца ўсе гаджэты. Магчыма, школьнікі самі будуць класці туды тэлефоны, а магчыма, яны будуць збірацца кіраўніком у пачатку ўрокаў і дастаўляцца ў гэтыя шафы ўпаўнаважаным прадстаўніком або асобай, якую вызначыў кіраўнік установы адукацыі. Нельга забываць і пра катэгорыю хворых, напрыклад, дзетак з цукровым дыябетам — у іх тэлефоны павінны быць заўсёды пры сабе, гэта прадугледжана і ў пастанове Міністэрства адукацыі.

Абмежаванні карыстання мабільным тэлефонам закранулі і настаўнікаў.

— Яны ж павінны паказваць дзецям прыклад, — тлумачыць Ірына Каржова. — Калі на ўроку няма мабільнай сувязі, значыць, няма для ўсіх. Вядома, апарат у педагогаў застаецца — мала што можа здарыцца. Але карыстацца ім, як і вучням, нельга. Мне часта задаюць пытанне: якое пакаранне чакае школьніка, калі ўсё ж ён умудрыўся пранесці тэлефон у навучальны клас. Ды ніякага — толькі размова і тлумачэнне, з ім і яго бацькамі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**



Новая школа ў Мінску гатова прыняць сваіх вучняў.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Озерицкий-Агро»** (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ **ЗДАНИЯ КОНТОРЫ**

*(составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание конторы с навесом, площадкой, дорожкой)*, **инв. № 601/С-30063, общей площадью 434,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623280407601000154 площадью 0,0736 га** *(право аренды по 23.09.2040)* **по адресу: Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Семково, ул. Болотная, 3А.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 107 567,57** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **10 756,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **30.09.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 347 22 75.**

УНП 690363881



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению **государственного предприятия «Минский областной технопарк»** (продавец, местонахождение: Смолевичский район, д. Станок Водица, ул. Заводская, 1) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1**
**Ленточнопильный станок Pegas 360*500 GH-LR,**
**2011 г. в., серийный № 3600221001, инв. № по бух. учету 631.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 20 898,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **2 089,00 бел. руб.**

**Лот № 2**
**Токарно-винторезный станок ГС526У-01,**
**2009 г. в., заводской № 372, инв. № по бух. учету 608.**
**Начальная цена с НДС (20%) – 20 142,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **2 014,00 бел. руб.**

**Лот № 3**
**Универсальный фрезерный станок «ОРША-Ф32 У.31»,**
**2009 г. в., заводской № 72, инв. № по бух. учету 311.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 50 814,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **5 081,00 бел. руб.**
**Стоимость лотов снижена на 55 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608, и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.04.2025, 21.05.2025, 13.06.2025, 10.07.2025, 06.08.2025.

Электронные торги состоятся **16.09.2025** в **10.00** на torgi.rlt.by. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.09.2025** до **17.00.**

**Тел. организатора торгов: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 690-38-46.**

УНП 600017416



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

Электронные торги состоятся **30.09.2025 в 10.00**

**Лот № 1**
Кузов вагона пассажирского в сборе с вагона № 013 10713, 1984 г. в.
Местонахождение: Республика Беларусь, г. Лунинец, ул. Паровозная, 11.

**Начальная цена без НДС** – 91 000,00 руб.

Извещение о проведении электронных размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Гипросвязь», г. Минск, ул. Сурганова, 24, ком. 219. УНН 100230534 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| <u>**Легковой специальный универсал SKODA YETI,**</u> 9146 HI-7, 2013 г. в. Месторасположение: г. Минск, ул. Сурганова, д. 24 | |
| **Начальная цена с НДС – 16 524,00 бел. руб.** (снижена на 34 %) Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.06.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 12.09.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Озерицкий-Агро»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**• здание телятника**
**с инв. № 614/С-48943 общей площадью 1314,1 кв. м;**

**• здание коровника**
**с инв. № 614/С-48942** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)* **общей площадью 1608,8 кв. м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624800000001004920 площадью 3,0322 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в районе д. Аношки.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0450 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,4320 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 330 726,45 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **33 072,00 бел. руб**.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи объектов.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 16.12.2021, 08.06.2024, 31.07.2024, 14.02.2025.

Аукцион состоится **16.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.09.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01776) 5-13-65, 8 (029) 347-22-75.**

УНП 690363881

08.09.2025 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня
1) Об установлении вознаграждения.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.
Для регистрации необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата сбора реестра акционеров – 29.08.2025 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 01.09.2025 (с 14.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

# ШКОЛЬНЫЯ НАВАЦЫІ



## З 1 ВЕРАСНЯ ЎСТУПАЮЦЬ У СІЛУ НОВАЎВЯДЗЕННІ, УНЕСЕНЫЯ Ў КОДЭКС АБ АДУКАЦЫІ

**Сёння, калі да Дня ведаў засталося ўсяго некалькі дзён, нагадаем асноўныя навацыі. Адразу адзначым, што якіх-небудзь маштабных змен не адбылося, аднак некаторыя важныя аспекты падвергліся карэкціроўцы. Нязменнай засталася і асноўная мэта абноўленага кодэкса — павышэнне якасці адукацыі.**



Навучэнцы X—XI класаў сярэдніх школ, размешчаных у пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах, а таксама спецыялізаваных ліцэяў, Мінскага суворАўскага ваеннага вучылішча і кадэцкіх вучылішчаў змогуць атрымаць вадзіцельскае пасведчанне.



Вучні XI класаў могуць вызваляцца ад выніковых іспытаў па медыцынскіх паказаннях. Пералік захворванняў вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя, а іншыя падставы ўстанаўлівае Мінадукацыі.



Калі навучэнец не прыйшоў на ЦЭ па ўважлівай прычыне, ён таксама зможа пераздаць экзамен у рэзервовы дзень.



З 26 мая да 5 чэрвеня — вучэбна-палявыя зборы для ўсіх 10-класнікаў.
Да прыняцця змяненняў 10-дзённыя зборы былі толькі ў кадэтаў і суворАўцаў.



Прыёмныя бацькі і бацькі-выхавальнікі будуць уключаны ў лік педработнікаў.



Анлайн-навучанне (дыстанцыйнае) на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі не прадугледжана.

### Дзелавы стыль адзення школьнікаў.

Пры наведванні вучэбных заняткаў навучэнцы, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, абавязаны прытрымлівацца дзелавога стылю ў адзенні, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі.



### З 1 верасня забаронена выкарыстанне мабільных тэлефонаў падчас навучальнага працэсу.

Гэта значыць, што пры ўваходзе ў школу мабільнік давядзецца адключыць (або перавесці ў бясшумны рэжым) і пакінуць у спецыяльнай ячэйцы. Вярнуць гаджэт можна будзе толькі пасля ўрокаў. Гэтая забарона адносіцца і да смарт-гадзіннікаў.

Выключэнні:

— дазволяць насіць пры сабе мабільныя тэлефоны дзецям, якім патрабуецца маніторынг стану цукру ў крыві пры цукровым дыябеце і іншых медыцынскіх рэкамендацыях;

— можна будзе выкарыстоўваць для вучобы планшэты і электронныя кнігі пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў, напрыклад пры парушэннях апорна-рухальнага апарату, калі нельга насіць цяжкі заплечнік з падручнікамі. Але гаджэт павінен быць без доступу ў інтэрнэт і мабільнай сувязі.



### Захоўваюцца льготы пры праездзе транспартам агульнага карыстання.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права прымаць рашэнні аб бясплатнай перавозцы навучэнцаў:

— у межах населеных пунктаў, дзе яны пражываюць, да ўстановы адукацыі і назад школьнымі аўтобусамі па маршруце іх руху пры адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў транспартам агульнага карыстання або немагчымасці забеспячэння такой перавозкі;

— да месцаў правядзення адукацыйных мерапрыемстваў, экскурсій, фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, спартыўных, культурных мерапрыемстваў і назад.

*Сёння прадугледжаны падвоз навучэнцаў толькі ў сельскіх населеных пунктах да ўстаноў дашкольнай і агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі і назад пры пэўных умовах.*






Для вучняў X-XI класаў уводзіцца новы навучальны прадмет — «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі»



Выпускнікі, якія на цэнтралізаваным экзамене атрымалі 0 балаў, цяпер змогуць пераздаць яго ў жніўні.



Павялічваецца з двух да трох у тыдзень колькасць урокаў па прадмеце «Фізічная культура і здароўе».



Інклюзіўная адукацыя. Дзецям, якія навучаюцца дома, дадаюцца гадзіны для вывучэння наступных прадметаў: «Выяўленчае мастацтва», «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», «Мастацтва» і «Чарчэнне».



Законныя прадстаўнікі дзяцей, якія жывуць у нашай краіне, абавязаны забяспечыць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі ў Беларусі.



З 1 верасня індывідуальныя прадпрымальнікі не маюць права рэалізоўваць адукацыйныя праграмы дашкольнай адукацыі.

**Ликвидатор ООО «ЭффектКонсалт»**
извещает о проведении первых электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «ДронИнвест»,** УНП 193704970,
в форме аукциона

**Общие сведения о лотах:** Сельскохозяйственный дрон с дополнительным оборудованием.
**Продавец:** ООО «ДронИнвест».
**Место проведения торгов:** электронная торговая площадка https://aferta.by/
**Срок подачи заявок:** не позднее 29.09.2025 до 16.00.
**Дата проведения электронных торгов:** 02.10.2025.

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Сельскохозяйственный дрон с дополнительным оборудованием | 211 920,61 |

Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются на сайте https://aferta.by/.

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с BY66ALFA30122C59770010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X; получатель – ООО «БелКомиссионер», УНП 193648539.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **открытого акционерного общества «Весейский Покров»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже

**АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ**
**с инв. № 640/С-87804 общей площадью 508,1 кв. м,**

**расположенного на земельном участке площадью 0,2036 га** ***(право аренды по 13.06.2033)*** **с кадастровым номером 624687201401000050 по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Калита, ул. Центральная, 4.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **7655,98** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **765,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 12.04.2025, 05.07.2025.*

Аукцион состоится **17.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.09.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (801795) 4-82-57, (8029) 340-15-01.**

УНН 600043258

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Слуцкая Нива»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже

**ЗДАНИЯ БРИГАДНОГО ДОМА**
**с инв. № 640/С-114842 общ. пл. 152,3 кв. м,**

**адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Кировский с/с, 14А, 50 м восточнее от жилого дома д. Новодворцы, пер. Садовый, 4, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624682700001000912 (право аренды по 23.06.2055) площадью 0,2532 га, адрес земельного участка: Минская обл., Слуцкий р-н, Кировский с/с, 14А, вблизи д. Новодворцы**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона электрической сети (0,0158 га), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги (0,2203 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **27 952,07** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2795,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600 169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **30.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 044 720 65 05.**

УНП 600043508

# ТЭЛЕФОН НА ПАЛІЧКУ

## Пацікавіліся, як школы будуць спраўляцца з новаўвядзеннем аб забароне гаджэтаў падчас заняткаў

Новы навучальны год вось-вось пачнецца. Хвалюючы момант для бацькоў, настаўнікаў і дзяцей. Карэспандэнт «Звязды» пагаварыла з дырэктарамі школ аб тым, як яны рыхтаваліся да новага навучальнага года, а таксама даведалася, як будзе арганізавана праца ў сувязі з тым, што мабільныя тэлефоны ў школе цяпер пад забаронай.



Аб тым, як будуць складвацца справы ў сувязі з новаўвядзеннем, стане зразумела пазней. Хоць многія школы самі ўводзілі абмежаванні на выкарыстанне мабільнікаў. Тэлефоны здаваліся ў асобную скрыначку на час урока.

### ПАКІНЬЦЕ ГАДЖЭТЫ Ў НАСТАЎНІЦКАЙ

У гімназіі № 10 імя Мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева) г. Гродна такая практыка выкарыстоўваецца ўжо на працягу некалькіх гадоў, расказала дырэктар Алена Зінчук. У новым навучальным годзе за парты сядуць больш за 1000 хлопчыкаў і дзяўчынак.

**Выкарыстанне мабільных тэлефонаў у школах забаронена ў Італіі, Грэцыі, Партугаліі, Нідэрландах, Даніі і Кітаі.**

— Многія бацькі спакойна паставіліся да такога новаўвядзення. Маці і таты не выказалі вялікіх прэтэнзій, бо разумеюць, што пры неабходнасці настаўнік можа даць дзіцяці тэлефон для сувязі. Вядома, былі нязгодныя, але ўсё вырашаецца праз дыялог. Для захоўвання тэлефонаў вучняў у настаўніцкай абсталяваны спецыяльныя месцы — шафы з падпісанымі аддзяленнямі для кожнага класа. Усё замыкаецца на ключ. За захаванасць тэхнікі перажываць не варта. Школа поўнасцю гатова, праведзены ўсе неабходныя рамонтныя работы. Мінулай восенню дзякуючы гарадской адміністрацыі адкрылася абноўленае спартыўнае ядро — стадыён, які меў патрэбу ў рамонце. У гэтым годзе быў праведзены рамонт даху будынка і закуплены станкі ў кабінет працы для хлопчыкаў. Сярод новаўвядзенняў — з'яўленне педагагічнага класа. Акрамя таго, у гімназіі працягваюць работу тры ваенна-патрыятычныя класы. На факультатыўным узроўні вучні вывучаюць кітайскую мову ў дадатак да англійскай. Вельмі рады, што бацькі бяруць актыўны ўдзел у жыцці гімназіі, асабліва ў пытаннях добраўпарадкавання. Яны дапамагаюць у падрыхтоўцы класаў і тэрыторыі да новага навучальнага года.

### У ФАЕ ПАД КАМЕРАЙ

З нецярпеннем дзяцей чакаюць і ў СШ № 11 імя генерала арміі А. І. Антонава г. Гродна. Сёлета школа актыўна рыхтавалася да пачатку навучальнага года. Дырэктар школы Марына Кароза ўдзяліла асаблівую ўвагу кадравым пытанням: у школе з'явіліся шэсць маладых спецыялістаў — педагог сацыяльны, два настаўнікі пачатковых класаў, настаўнік англійскай мовы, настаўнік фізічнай культуры і здароўя. Апошні — выпускнік каледжа, які пасля вучобы ва ўніверсітэце вярнуўся ў родную школу. Акрамя таго, школа атрымала значную падтрымку ад кіраўніцтва горада. Былі выдзелены бюджэтныя сродкі на рамонт. У дзяцей актыўныя бацькі, якія заўжды з радасцю прыходзяць на дапамогу. Напрыклад, сёлета маці і таты дапамаглі вывезці нямала будаўнічага смецця, да іх далучыліся і супрацоўнікі Гродзенскай пагранічнай групы.

— У нашай школе ўжо не першы год вядзецца работа па абмежаванні выкарыстання мабільных тэлефонаў навучэнцамі. У кожным класе ўстаноўлены спецыяльныя боксы з ячэйкамі для тэлефонаў. З пачаткам урока вучні здавалі свае прыстасаванні, а пасля яго заканчэння маглі забраць іх назад. Рашэнне цалкам абмежаваць выкарыстанне мабільных абмяркоўвалася бацькамі. Большасць з іх падтрымалі яго, адзначыўшы, што смартфоны адцягваюць дзяцей ад вучобы і не спрыяюць развіццю асобы. Шафы для тэлефонаў размешчаны ў фае на першым паверсе, побач з месцам, дзе знаходзяцца пазаведамасная ахова і камеры відэаназірання. Шафкі замыкаюцца на ключ і ўвесь дзень знаходзяцца пад наглядам.

**А як у іх?**

**У Францыі, напрыклад, тэлефоны забаранілі яшчэ ў 2010 годзе, а з 1 верасня 2018 года навучэнцаў пазбавілі права ўвогуле прыносіць у школы любыя гаджэты, якія маюць выхад у інтэрнэт. Закранула забарона таксама планшэты і смарт-гадзіннікі.**

### ПАД АХОВАЙ — НА ПАСТУ АХОВЫ

Да новага навучальнага года гатовы і ў Верцялішкаўскай сярэдняй школе. Тут прынялі рашэнне арганізаваць захоўванне гаджэтаў на пасту аховы. Такім чынам, тэхніка заўсёды будзе пад наглядам. Дырэктар школы Алег Казак адзначыў, што ў школе паглядзяць, наколькі зручна яны ўсё прадумалі.

— Вядома, дзецям такая ідэя не вельмі спадабалася. А вось бацькі ў большасці сваёй пагадзіліся з тым, што такую практыку будзе правільным рашэннем. Хоць некаторыя дарослыя сумняваюцца, што змогуць знайсці хутка дзіця, калі ім спатрэбіцца з ім звязацца. Але класны кіраўнік і адміністрацыя школы заўжды на сувязі. Не варта перажываць, што камунікацыя будзе ўскладнена. І калі дзіцяці трэба будзе патэлефанаваць маці ці тату, яму ніхто не будзе забараняць. Хоць, калі так падумаць, практыка не зусім новая. На ўроках дзеці здавалі тэлефоны настаўніку. На мой погляд, гэта правільнае рашэнне, бо дзеці змогуць больш камунікаваць паміж сабой.

Дырэктар адзначыў, што школа поўнасцю гатова да прыняцця дзяцей, усе работы завершаны, а план па іх рэалізацыі намечаны яшчэ ў студзені 2025-га. Былі ўлічаны ўсе ўказанні зацікаўленых арганізацый, а работа пачалася яшчэ падчас вясновых канікулаў.

Самая галоўная задача школы — даць адукацыю дзецям. Але пры гэтым ніхто не адмяняе выхаваўчай функцыі, падтрымкі, настаўніцтва. Школы Гродзеншчыны чакаюць хлопчыкаў і дзяўчынак, а як будзе працаваць новаўвядзенне, якое датычыць мабільных тэлефонаў, — пакажа час.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, фота аўтара.**

## Будзьце ў курсе



У забароне праносіць мабільныя на ўрок ёсць свае выключэнні. У прыватнасці, яны датычацца дзяцей і падлеткаў, якія маюць патрэбу ў мабільных прыладах па стане здароўя. Напрыклад, гэта можа быць неабходна для маніторынгу цукру ў крыві пры цукровым дыябеце (той выпадак, калі дзіця знаходзіцца на помпавай інсулінатэрапіі) або калі ў маленькага пацыента выяўлена захворванне, звязанае з парушэннем рытму сэрца.

У Міністэрстве аховы здароўя падкрэслілі, што для вызначэння групы дзяцей, якім неабходна выкарыстоўваць мабільныя ўстройствы ва ўстановах адукацыі, мэтазгодна дадаць у медыцынскую даведку наступную рэкамендацыю: «Кантроль глікеміі праводзіцца сістэмай бесперапыннага маніторынгу глюкозы з выкарыстаннем мабільнага дадатку» або «Кантроль рытму сэрца фіксуецца з дапамогай мабільнага дадатку».

